ты харчавання і прадстаўнікі іншых спецыяльнасцей. І толькі паводле звестак па 5 гарадах Віцебскай губерні за 1862 год большасць рамеснікаў (35%) займаліся вырабам прадметаў хатняга ўжытку, амаль роўна па колькасці было тых рамеснікаў, якія займалася вырабам прадметаў адзення і прадуктаў харчавання (па 25%), 15% складалі прадстаўнікі іншых спецыяльнасцей[1].

У канцы XIX ст. у гарадах Віленскай і Мінскай губерняў пераважала па колькасці група рамеснікаў, якія выраблялі прадметы адзення (32,4% і 42% адпаведна). У гарадах Віцебскай і Гродзенскай губерняў большасць рамеснікаў была занятая вырабам прадметаў хатняга ўжытку (34% і 33% адпаведна). Самай пашыранай (а значыць і запатрабаванай) спецыяльнасцю сярод рамеснікаў беларускіх гарадоў былі краўцы (нпр., у Віцебскай губерні – 11%, у Гродзенскай – 11%, у Мінскай – 17%), шаўцы (11%, 12%, 16,5% адпаведна), фурманы (10%, 9%, 7% адпаведна), сталяры (5%, 7%, 7% адпаведна) і інш.[2]

Аналіз Ведамасцей аб колькасці рамеснікаў па гарадах і паветах беларускіх губерняў дазваляе адзначыць нам новыя рамесніцкія спецыяльнасці, якія ўзнікаюць на мяжы XIX і XX стст.: аптэкары (у Дзісне, Друі), калбаснікі (у Вілейцы, Лідзе), куфаршчыкі і валізнікі (у Лідзе), літографы (у Бабруйску, Слуцку, Нясвіжы, Мінску), пальчатачнікі (у Ашмянах, Вілейцы, Дзісне, Друі, Лідзе), парасоншчыкі (у Ашмянах, Лідзе), фатографы (у Ашмянах, Бабруйску, Мінску, Лідзе, Пінску), цвікоўшчыкі (у Брэсце) і інш.

**Заключэнне.** На працягу другой паловы XIX ст. спецыялізацыя рамеснай вытворчасці на Беларусі працягвае пашырацца. З аднаго боку павелічэнне колькасці рамесніцкіх спецыяльнасцей сведчыць аб далейшым развіцці працэсу падзелу працы, што характэрна для капіталістычнага грамадства. З другога боку, на нашу думку, далейшае развіццё рамеснай вытворчасці замаруджвала тэмпы фарміравання індустрыяльнага грамадства. Рамесная вытворчасць, хоць і не адрознівалася якасцю, аднак па прычыне свайго адносна больш таннага кошту, была запатрабаванай у насельніцтва. Прадпрыемствы, якія былі заснаваны на індывідуальнай працоўнай дзейнасці ці на якіх выкарыстоўвалася праца некалькіх наёмных рабочых, лёгка рэагавалі на запатрабаванні рынку паслуг і тавараў паўсядзённага попыту, хучэй маглі пераарыентаваць сваю вытворчасць.

1. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений: в 50 т. /В.И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979-1983. – Т.3: Развитие капитализма в России. – 791 с.
2. Болбас, М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1900/ М.Ф. Болбас. – Минск: Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.
3. Памятная книжка Минской губернии за 1860 год/ Составлена и издана Минским губ. стат. комитетом.- Минск: Губ. Тип., 1860. – С. 88-91.
4. Памятная книжка Гродненской губернии на 1900 год /Изд. Гродн. губ. стат. комитетом. - Гродно: Губ. тип.: 1899. – С.26-33.
5. Обзор Витебской губернии за 1895 год: приложение к всеподданейшему отчету Витебского Губернатора за 1895 год. - Витебск, 1896. – С. 8-9.
6. НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1862 – Л. 15, 35.
7. Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год/ Изд. Могил. губ. правлением. - Могилев: Тип. губ. правл., 1861. – С. 113-123.
8. Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 год/ Сост. Гродн. губ. стат. комитетом. - Гродно: Тип. губ. правл.,1861. – С.135.
9. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год/ Изд. Вит. губ. стат. комитетом под ред. А.М. Сементовского. - Санкт-Петербург: Тип. К. Вульфа, 1864. – С. 238-239.
10. Обзор Виленской губернии за 1900 год: приложением к Всеподданнейшему отчету начальника Виленской губернии. - Вильно: Губ. тип., 1901. – С.136-138.
11. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 74. – Л. 26-31.
12. НГАБ у Гродне. – Фонд 14. – Воп. 1. – Спр. 609. – Л. 116-119.

## ВІЦЕБСКІЯ ГУБЕРНАТАРЫ: САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА (1864–1917 ГГ.)

***Ляпешкін Я.М.,***
*аспірант БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Лукашэвіч А.М., доктар гіст. навук, прафесар*

У дарэвалюцыйную эпоху губернатары з'яўляліся вышэйшымі прадстаўнікамі мясцовых органаў дзяржаўнай улады і рэалізоўвалі палітыку цэнтра. Ад іх шмат у чым залежалі асноўныя напрамкі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця ў губернях. Таму выяўленне сацыякультурнага аблічча гэтай катэгорыі чыноўнікаў вельмі важна для аб'ектыўнай ацэнкі адпаведнай эпохі.

[1] Падлікі зроблены аўтарам артыкула на падставе: [3], [7], [8], [9].
[2] Тут і далей дадзеныя падаюцца на падставе: [10], [4], [11], [12].



Рэпазіторый ВДУ

Мэта даследавання – прааналізаваць сацыякультурныя характарыстыкі корпуса віцебскіх губернатараў за 1864–1917 гг.

**Матэрыял і метады.** Падчас даследчай працы былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя, спецыяльна-гістарычныя і колькасныя.

Для стварэння сацыякультурнага вобраза губернатараў выкарыстоўваліся асноўныя асабістыя паказчыкі, якія адлюстроўваліся ў фармулярных (паслужных) спісах (узрост, паходжанне, веравызнанне, адукацыя, тытулы, чыны, класы, сямейнае становішча і інш.). Паколькі ў гэтых дакументах паняцце "нацыянальнасць" не ўжывалася, этнічная прыналежнасць вызначалася па паходжанні (аднясенню дваранскага роду да той ці іншай губерні), месцу нараджэння (па размяшчэнні радавога маёнтка, калі адсутнічала дакладная інфармацыя) і веравызнанні.

Для вызначэння ўзросту на момант прызначэння на пасаду губернатара ўлічвалася дата нараджэння. Калі дзень і месяц нараджэння невядомы, то ў якасці такіх дадзеных бралася дата 1 студзеня [1, с. 12]. Калі невядомы і год нараджэння, але ёсць дата ўступлення на службу, ад яе адымалася 20 год і атрыманая дата ўлічвалася, як прыблізная дата нараджэння [2, с. 23–24].

Час знаходжання на губернатарскай пасадзе вылічваўся з моманту прызначэння на яе, або заняцця яе на правах "выканання пасады". У выпадку наяўнасці ў губернатара некалькіх адукацый, улічвалася навучальная ўстанова вышэйшага ўзроўню. Усе дадзеныя аб ваенных і грамадзянскіх чынах адпавядалі пэўным класным чынам Табелі аб рангах.

Папярэдняя і наступная служба губернатара вылучалася як грамадзянская ці ваенная. Сямейнае становішча вызначалася на час губернатарства ў Віцебску.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Падлікі паказваюць, што на працягу 1864–1917 гг. Віцебскую губерню ўзначальвалі 12 чалавек. Сярэдні ўзрост віцебскіх губернатараў на момант прызначэння на пасаду або заняцця пасады ў якасці "выконваючага пасаду" складаў 44,7 года. Сярэдняя працягласць знаходжання на губернатарскай пасадзе складала 4,4 года.

У цэлым, сацыяльнае, канфесійнае і "нацыянальнае" (рэгіянальнае) паходжанне віцебскіх губернатараў было наступным. Усе 12 чыноўнікаў належалі да дваран (11 спадчынныя, І.І. Чапялеўскі – дакладна не вызначана), 8 з іх паходзілі з велікарускіх губерняў, 1 – з прыбалтыйскіх (В.В. Валь – Ліфляндская), 1 – з украінскіх (П.Я. Растоўцаў – Чарнігаўская), 2 – не ўдалося выявіць. Па веравызнанні 6 губернатараў з'яўляліся праваслаўнымі, 2 – лютэранамі (В.В. Валь, Б.Б. Гершаў-флотаў), 4 – дакладна не ўстаноўлена [3, с. 507–513; 4, с. 319; 5, с. 56–57; 6, с. 23–24 (4-я паг.); 7, с. 246; 8, с. 163, 221, 575, 726; 9, с. 214; 10, с. 108–109; 11, с. 32, 243; 12, арк. 44 зв., 53 зв., 55; 13, с. 761; 14, с. 3 (3-я паг.); 15, с. 175–176; 16, с. 266, 275, 282; 17, арк. 3 зв., 19 зв.; 18, с. 470; 19, с. 282; 20, с. 314; 21, с. 53 (3-я паг.); 22, с. 35; 23, арк. 1 зв., 9 зв.–11].

Досыць цікавай з'яўляецца інфармацыя аб узроўні адукацыі віцебскіх губернатараў. Так, 12 з іх скончылі навучальныя ўстановы ваеннага або грамадзянскага ведамстваў. Пры гэтым 1 губернатар атрымаў вышэйшую ваенную адукацыю, 6 – вышэйшую свецкую, 4 – сярэднюю ваенную, 1 – сярэднюю свецкую [3, с. 507–513; 4, с. 319; 5, с. 56; 7, с. 246; 8, с. 40, 163, 221, 575, 726; 9, с. 214; 10, с. 108; 12, арк. 44 зв.; 13, с. 761; 14, с. 3 (3-я паг.); 16, с. 266, 275, 282; 17, арк. 3 зв.; 24, с. 25 (4-я паг.)].

Да тытулаваных дваранскіх родаў належалі 3 губернатары: 1 меў тытул барона (Б.Б. Гершаў-флотаў), 1 – графа (П.Я. Растоўцаў), 1 – князя (В.М. Далгарукаў). Да моманту прызначэння на пасаду віцебскага губернатара ўсе кандыдаты мелі чын па грамадзянскаму ведамству не ніжэй за стацкага саветніка, альбо – па ваеннаму ведамству не ніжэй за генерал-маёра. Так, 3 губернатары з'яўляліся – стацкімі саветнікамі, 7 – сапраўднымі стацкімі саветнікамі, 2 – генерал-маёрамі. Адпаведна, па Табелі аб рангах яны прыналежалі да наступных класаў: 3 мелі чын V класа, 9 – IV. Пры звальненні з губернатарскай пасады становішча выглядала наступным чынам: 1 асоба была стацкім саветнікам, 2 – генерал-маёрамі, 6 – сапраўднымі стацкімі саветнікамі, 3 – тайнымі саветнікамі. Адпаведна, яны мелі чыны: 1 асоба – V, 8 – IV, 3 – III класа. Значыць, чын і клас большасці губернатараў падчас службы ў Віцебску не змяніліся.

Аб паспяховасці кар'еры чыноўнікаў сведчаць іх найвышэйшыя чыны і класы. Так, сярод тых, хто прайшоў віцебскае губернатарства, 1 асоба мела чын стацкага саветніка, 2 – сапраўднага стацкага саветніка, 7 – тайнага саветніка, 2 – генерала ад інфантэрыі (кавалерыі). Такім чынам, па Табелі аб рангах яны мелі наступныя чыны: 1 асоба была ў чыне V класа, 2 – IV класа, 7 – III класа, 2 – II класа [3, с. 507–513; 4, с. 319; 7, с. 246; 8, с. 40, 150, 163, 221, 331,



Рэпазіторый ВДУ

370, 575, 666, 726; 9, с. 214; 10, с. 109; 12, арк. 51 зв.–52, 56; 16, с. 266, 275, 282; 17, арк. 10 зв.; 23, арк. 8 зв.–9; 25, с. 163; 26, с. 762; 27, с. 81; 28, с. 228;].

Для разумення сацыяльнага аблічча віцебскіх губернатараў важнае значэнне мае інфармацыя пра кар'еру чыноўнікаў. Аналіз паказвае, што да заняцця пасады віцебскага губернатара 9 асобаў мелі вопыт ваеннай службы, а 10 – грамадзянскай службы. Пасля губернатарства ў Віцебску 2 чыноўнікі займалі ваенныя пасады, 6 працягнулі грамадзянскую службу.

У кар'еры 5 віцебскіх губернатараў пасада начальніка губерні засталася найвышэйшай. 1 чыноўнік быў начальнікам мясцовых войскаў Віленскай ваеннага акругі, 3 – сталі членамі Савета Міністэрства ўнутраных спраў, 1 – членам Дзяржаўнага савета, 2 – сенатарамі [3, с. 507–513; 4, с. 319; 5, с. 56–57; 7, с. 246; 8, с. 150, 163, 575, 726; 9, с. 214; 10, с. 108–109; 11, с. 32, 243; 12, арк, 55–56; 13, с. 761–762; 16, с. 266, 275, 282; 17, арк. 18 зв.–19; 21, с. 53 (3-я паг.); 23, арк. 1–11; 27, с. 81].

Для фарміравання сацыякультурнага аблічча чыноўніка вялікае значэнне мае сямейнае становішча. Паколькі большасць губернатараў былі ў сталым узросце, то амаль усе яны падчас кіравання ў Віцебску з'яўляліся людзьмі жанатымі (8 з 12), прычым большасць – мела і дзяцей (9). Пры гэтым важнай асаблівасцю сям'і віцебскіх губернатараў з'яўлялася іх шматдзетнасць. Як паказваюць сярэднія вынікі, колькасць дзяцей у губернатарскіх дзетных сем'ях складала 3,3 дзіцяці [7, с. 246; 10, с. 108; 11, с. 32, 243; 12, арк. 45; 17, арк. 4; 18, с. 471; 23, арк. 2; 29, с. 232].

**Заключэнне**. Праведзены аналіз дазваляе скласці наступную абагульненую сацыякультурную характарыстыку віцебскага губернатара. Гэта рускі, які паходзіў са спадчыннага дваранскага роду, ураджэнец адной з велікарускіх губерняў, праваслаўнага веравызнання. Атрымаў вышэйшую або сярэднюю спецыяльную (ваенную ці грамадзянскую) адукацыю. Меў абавязковы вопыт грамадзянскай ці ваеннай службы. На губернатарскую пасаду прызначаны ва ўзросце 44,7 года і ў чыне сапраўднага стацкага саветніка (IV класа). Чалавек сямейны, меў 3 дзяцей. Кіраваў Віцебскай губерняй 4,4 года і пакінуў пасаду ў чыне IV класа. У далейшым працягваў службу па грамадзянскаму ведамству і даслужыўся да чына III класа.


1. Зайончковский, П. А. Правительственный аппарат самодержавной России в XIX в. / П. А. Зайончковский – М.: Мысль, 1978. – 288 с.
2. Кузьмин, А. Д. Социокультурный облик чиновничества белорусских губерний (1864–1914 гг.): монография / А. Д. Кузьмин. – Могилев: МГУП, 2017. – 187 с.
3. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917): справочник / Т. Е. Леонтьева [и др]. – Минск: Белорус. науч.-исслед. ин-т документоведения и арх. дела, 2009. – 523 с.
4. Веревкин Владимир Николаевич // Военная энциклопедия: [в 18 т.] / под ред. В. Ф. Новицкого [и др.]. – СПб.; [М.], 1911. Т. 5. – С. 319.
5. Павловский, И. Ф. Полтавцы: иерархи, государственные и общественные деятели и благотворители: опыт краткого биографического словаря Полтавской губернии с половины XVIII в. / И. Ф. Павловский. – Полтава, 1914. – XV, 294 с.: 182 портр.
6. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год / Витеб. губерн. стат. ком. Исторический очерк 50-летия Витебского губернского статистического комитета (22 сентября 1863 – 22 сентября 1913) / А. Сапунов. – Витебск: Губерн. тип., 1914. – [2], VIII, 280, LXX, [2], 42 с.
7. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю.Н. Снапковский; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2016. – 398, [2] с.
8. Волков, С. В. Высшее чиновничество Российской империи: краткий словарь / С. В. Волков. – М.: Университет Дмитрия Пожарского, 2016. – 796 с.
9. Ростовцов, Павел Яковлевич // Русский биографический словарь: в 25 т. / Изд. Русское историческое общество: под ред. Б. Л. Модзалевского. – Петроград, 1918. – Т. 17. – С. 214.
10. Шилов, Д. Н. Члены Государственного совета Российской империи, 1801–1906 гг.: биобиблиографический справочник / Д. Н. Шилов, Ю. А. Кузьмин. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2007. – 992, [1] с.
11. Мурзанов, Н. А. Словарь русских сенаторов, 1711–1917 гг.: материалы для биографий / Н. А. Мурзанов. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2011. – 735 с., [17] л. ил.
12. НГАБ. – Ф. 1416. Воп 2. Спр. 19541. Дело о службе Витебского губернатора действительного статского советника Ивана Ильича Чепелевского. 03.06.1899–27.08.1899.
13. Альманах современных русских государственных деятелей / изд. Германа Александровича Гольдберга. – СПб: Тип. Исидора Гольдберга, 1897. – XXXIX, 15, 1250, [4] с.
14. Памятная книжка Витебской губернии на 1909 год / Витеб. губерн. стат. ком. – Витебск: Губерн. тип., 1909. – VIII, 28, 425, 152 с.
15. Вернер, И. Л. На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) / И. Л. Вернер // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / Нац. гіст. арх. Беларусі; рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск., 2007. – Вып. 5. – С. 175–187.
16. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918): сб. документов / сост. В. В. Врублевский [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко (пред.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 2014. – 356 с.
17. НГАБ. – Ф. 1416. Воп 2. Спр. 25574. Формулярный список о службе Витебскаго губернатора (в звании камергера действительного статского советника Н. П. Галахова). 16.02.1916–10.11.1916.
18. Андреевский, Е. К. Особые взгляды (Из воспоминаний о П. П. Косаговском) / Е. К. Андреевский // Русская старина. – 1908. – Т. 133. – № 2. – С. 469–476.




Репозиторий ВГУ

19. Милорадович, Г. А. (1834–1905). Родословная книга Черниговского дворянства: [В 2-х т.] / Граф Г. А. Милорадович. – СПб.: Губ. тип., 1901. – Т. 2: Ч. 3, 4, 5, 6 и приложения. – 877 с. с разд. паг.; 3 л. ил.
20. Chimiak, L. Gubernatorzy Rosyjscy w Krolestwie Polskim: Szkic do potretu zbiorowego / L. Chimiak. – Wroclaw: Funna, 1999. – 358 s.
21. Правительствующий сенат: [Краткий исторический очерк и биографии сенаторов]. – СПб.: типо-лит. С.-Петерб. одиночной тюрьмы, 1912. – [16], 83, 172 с. с ил.; 6 л. ил.
22. Чины Двора, Свиты Их Величеств и потомственное Российской Империи дворянство. – СПб, 1913. – 128 с.
23. НГАБ. – Ф. 1416. Воп 2. Спр. 25555. Дело о службе Витебского губернатора в звании камергера императорского двора статского советника Б. Н. Хитрово. 13.12.1916 – 25.01.1917.
24. Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год / Витеб. губерн. стат. ком. – Витебск: Губерн. тип., 1898. – [2], IV, 43, [2], 24, [45], 25–138, [1], 343 с.
25. Список генералам по старшинству. Исправлено по 1-е января [1885 г.]. – СПб.: Воен. тип., 1885. – [2], XXVII, 832 с.
26. Список гражданским чинам IV класса. Исправлен по 1-е июня 1869 года. – 1869. – [2], 26, 901, 27 с.
27. Ростовцев Павел Яковлевич // Биографический словарь. Высшие чины Российской Империи (22.10.1721–2.03.1917) / сост. Е. Л. Потёмкин. – М., 2017. – Т. 3. С. 81.
28. Волков, С. В. Генералитет Российской империи: энциклопедический словарь генералов и адмиралов от Петра I до Николая II: [в 2 т.] / С. В. Волков. – Москва: Центрполиграф, 2010. – Т. 1. – 758, [1] с.
29. Из воспоминаний Е. И. Раевской // Русский Архив. – М.: Университетская типография, 1896 г. Вып. 1–4. – С. 220–241.

# ДИНАМИКА ЦЕННОСТЕЙ В СОВРЕМЕННОМ ОБЩЕСТВЕ (НА ПРИМЕРЕ ПОСТСОВЕТСКОГО ВОЛГОГРАДА)

***Мавродиева Е.,***
*независимый исследователь College of the Holy Cross, Факультет культурной антропологии, г. Вустер, Массачусетс, США*

После развала СССР город Волгоград, экономика которого зависела от централизованной индустрии, испытал много перемен не только в экономической, но и в социальной сфере. Как известно, экономические изменения влияют на динамику роли человека в обществе. В свою очередь гендер способствует распределению труда, которое изменяется в зависимости от экономической системы.

Цель исследования заключается в разъяснении социальных перемен, которые отразились в обществе на примере женщин трёх разных поколений в постсоветском пространстве Волгограда.

Тему русского социального кризиса идентичности в постсоветском пространстве обсуждали многие культурные антропологи, включая Юрчака, Вердери, Ушакина и Шевченко (2006, 2009, 1996, 2006). Вопрос гендерных изменений также поднимали Утрата, Годси, Ривкин-Фишь и другие исследователи (2015, 2005, 2005).

**Материал и методы.** Необходимо отметить, что материал для исследования не был собран для того, чтобы сделать исчерпывающие заключения. Материал собирался в течение пяти недель: проводились анонимные интервью с тридцатью женщинами трёх разных поколений, которые длились от получаса до четырех часов. Интервью были записаны на диктофон. Первое поколение женщин представлено теми, кто родился сразу после Великой Отечественной войны, второе – между 1960-1980 годами, третье – это те женщины, которые представляют поколение сразу после развала СССР в 1991 году. Участницы были выбраны случайным методом, и они добровольно согласились участвовать в опросе. Материальной награды за участие не предоставлялось. Все интервью транслировались и переводились с русского языка на английский и были проанализированы автором на английском языке. Принимая во внимание теорию Габитуса Бурдье, было проанализировано, каким образом повседневное участие личности в экономических системах формирует её концептуализацию и цели в отношении повседневной продуктивности.

**Результаты и их обсуждение**. Были рассмотрены способы, которыми повседневное участие в производстве воплощалось на микроуровне социальной репрезентации жизни опрашиваемых женщин, а также способы рассуждения респондентов о личностных ценностях и собственной самоидентификации.

Истории из жизни старших информантов вращались вокруг их желания выстроить разрушенный войной город. Мы утверждаем, что пожизненное участие в производстве благодаря обширному и трудоемкому вкладу в одержание победы под Сталинградом уже после войны укоренилось в социалистическом понимании того, что ценность жизни находится в производстве, связанным с коллективным использованием и направленным на улучшение качества жизни. Структура общества, основанная на марксистских, материалистических принципах, под-



Репозиторий ВГУ